Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар установы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай»
_____________Ю.Я. Раманоўскі
«15» 12. 2025 г.
Рэгістрацыйны № УД-418/25/уч.

# ТЭХНАЛОГІЯ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
**6-05-0112-01 «Дашкольная адукацыя»**
з прафілізацыяй «Лагапедыя»

2025 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0112-01-2023 і вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05-0112-01 «Дашкольная адукацыя» з прафілізацыяй «Лагапедыя». Рэгістрацыйны № 01-23/уч. ГФ зацверджанага 04.04.2023, для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі. Рэгістрацыйны № 01-23/уч.з. ГФ, зацверджанага 04.04.2023, для завочнай формы атрымання вышэйша адукацыі.

СКЛАДАЛЬНІК:
Таццяна Робертаўна Багарадава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

РЭКАМЕНДАВАНА ДЛЯ ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(Пратакол № 12 ад 19.11.2025 г.);

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(Пратакол № 3 ад 15.12.2025 г.)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Тэхналогія развіцця беларускага маўлення” уваходзіць у модуль “Тэхналогія развіцця маўлення”.

Вучэбная праграма вучэбнай дысцыпліны “Тэхналогія развіцця беларускага маўлення” накіравана на паспяховую рэалізацыю мэт і задач навучання методыцы развіцця беларускага маўлення ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму будучых педагогаў дашкольнай адукацыі ва ўстановах вышэйшай педагагічнай адукацыі першай ступені.

Актуальнасць зместу вучэбнай праграмы “Тэхналогія развіцця беларускага маўлення” вызначаецца тым, што ў ім адлюстраваны комплексны падыход да вырашэння задач развіцця маўлення і беларускамоўных зносін ва ўстанове дашкольнай адукацыі ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.

**Мэта** вучэбнай дысцыпліны:

фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці будучага педагога ў галіне методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму; фарміраванне падрыхтаванасці студэнтаў да арганізацыйна-кіраўніцкай, навукова-метадычнай дзейнасці ў галіне маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага блілінгвізму.

**Задачы** вучэбнай дысцыпліны:

- фарміраваць навуковыя веды аб працэсе развіцця маўлення і маўленчых зносін дзяцей ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага біліліңгвізму;
- садзейнічаць асэнсаванню ролі беларускай мовы як аднаго з фундаментальных і універсальных аспектаў нацыянальнай культуры;
- фарміраваць глыбокае разуменне ролі нацыянальнай мовы ў псіхічным развіцці дзіцяці; сутнасці паняццяў “білінгвальная адукацыя”, “білінгвальнае навучанне”, “білінгвальнае выхаванне” і асаблівасцей білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў Беларусі; працэсу беларускамоўнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту як сродку інкультурацыі;
- садзейнічаць асэнсаванню таго, што навукова абгрунтаваная методыка навучання беларускай мове і развіцця беларускага маўлення павінна абапірацца на разуменне сутнасці механізмаў авалодання роднай і другой мовамі, асаблівасці руска-беларускага двухмоўя дашкольнікаў; улічваць спецыфіку зместу і метадаў дашкольнай дыдактыкі;
- фарміраваць цэласныя педагагічныя веды аб сутнасці сучасных канцэпцый і тэхналогій навучання другой мове, развіцця беларускага маўлення і навучання нацыянальнай роднай мове дзяцей

дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму;

- фарміраваць ўменне дыягнаставаць, праектаваць і канструяваць працэс развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя;
- садзейнічаць авалоданню студэнтамі эфектыўнымі метадамі і прыёмамі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту;
- развіваць метадычнае мысленне, уменне ўжываць тэарэтычныя веды ў розных педагагічных сітуацыях.

У першых чатырох тэмах раскрываюцца тэарэтычныя асновы развіцця беларускага маўлення і навучання беларуская мове рускамоўных дашкольнікаў у сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму. У гэтай сувязі разглядаюцца механізмы і ўмовы авалодання дзецьмі роднай і другой мовамі. Асаблівая ўвага надаецца канцэптуальным асновам беларускамоўнага развіцця рускамоўных дашкольнікаў.

Наступныя тэмы можна разглядваць як тэарэтыка-метадычныя. У кожнай з іх пытанні методыкі развіцця беларускага маўлення і навучання беларускай мове цесна звязаны з данымі аб асаблівасцях развіцця маўлення дзяцей на першай засвоенай мове (рускай), параўнальным матэрыялам па беларускай і рускай лексіцы, граматыцы, фанетыцы.

Спецыфічнае месца займае апошняя тэма, звязаная з выкарыстаннем народнай педагогікі ў развіцці маўлення дзяцей, азнаямленнем іх з нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа.

У адпаведнасці з названымі мэтамі і прынцыпамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі выпускнік вышэйшай навучальнай установы павінен набыць наступную **спецыялізаваную кампетэнцыю:**

- ажыццяўляць працэс маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Тэхналогія развіцця беларускага маўлення” студэнт павінен

**ведаць**:

- заканамернасці засваення дзецьмі другой мовы;
- мэту, задачы і змест развіцця вуснага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўстановах дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання;
- асаблівасці фарміравання ўменняў маўленчай дзейнасці дашкольнікаў ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму;
- пабудову педагагічнага працэсу навучання рускамоўных дашкольнікаў нацыянальнай мове;

- канкрэтныя спосабы (метады і прыёмы) беларускамоўнага развіцця дзяцей, азнаямлення іх з беларускай культурай;

**умець**:

- выбіраць найбольш эфектыўныя метады і прыёмы навучання рускамоўных дзяцей беларускай мове;
- мадэліраваць, арганізоўваць і кіраваць працэсам дыдактычных беларускамоўных зносін;
- састаўляць план-канспект мерапрыемстваў па развіцці беларускага маўлення, планаваць асобны камунікатыўны акт, аналізаваць яго эфектыўнасць;

**валодаць**:

- навыкамі беларускамоўных зносін з дзецьмі, бацькамі, педагогамі;
- навыкамі арганізацыі работы па павышэнні культуры маўлення і ўзроўню азнаёмленасці з беларускай культурай педагогаў і бацькоў.

**Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.**

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца:

агульная колькасць гадзін – 108 (3 з.а.), аўдыторных – 52 гадзіны, з іх лекцыі – 26 гадзін, практычныя заняткі – 26 гадзін (з іх 16 гадзін – КСРС), 56 гадзін – на самастойную работу студэнтаў.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца у 6 семестры.

Форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

**Форма атрымання вышэйшай адукацыі – завочная.**

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца:

агульная колькасць гадзін – 108 (3 з.а.), з іх аўдыторных – 16 гадзін, лекцый – 8 гадзін, практычныя заняткі – 8 гадзін, 92 гадзіны – на самастойную работу студэнтаў.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца ў 7 семестры.

Форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел I. Навуковыя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення

#### Тэма 1. Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен

Сутнасць паняццяў "родная мова", "нацыянальная мова", "другая мова", "замежная мова". Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму; рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны білінгвізм; нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм; каардынацыйны і субардынацыйны білінгвізм; натуральны і штучны білінгвізм. З'явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва.

Праблемы ранняга двухмоўя. Узрост, спрыяльны для пачатку авалодання другой мовай. Суадносіны роднай і другой моў у навучальным працэсе. Уплыў двухмоўя на разумовае развіццё дзяцей. Праблема засваення другой мовы як сродку камунікацыі.

Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту.

Сутнасць пацяццяў "білінгвальная адукацыя", "білінгвальнае навучанне", "білінгвальнае выхаванне".

#### Тэма 2. Станаўленне, сутнасць і асаблівасці двухмоўнага выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі

Сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі, яе ўплыў на сферу дашкольнай адукацыі. Закон аб мовах Беларускай ССР. Пытанні маўленчага развіцця дашкольнікаў у Канцэпцыі развіцця дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (2000 г.). Статус беларускай мовы для рускамоўных дзяцей у Беларусі.

Асаблівасці руска-беларускага двухмоўя ў дашкольнікаў. Рэцэптыўнае і рэпрадуктыўнае двухмоўе. Усведамленне дзецьмі двухмоўнай рэчаіснасці, іх стаўленне да яе. Памылкі інтэрферэнцыі ў маўленні дашкольнікаў.

Мэта навучання беларускай мове. Дыдактычныя, выхаваўчыя, развіццёвыя і сацыялізуючая мэтавыя арыентацыі навучання. Задачы і змест работы па развіцці маўлення ў вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі. Узаемасувязь у навучанні беларускай і рускай мовам. Лінгвакультаралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове.

Узрост, з якога трэба пачынаць навучанне беларускай мове як другой роднай. Прынцып "адна асоба ў адной сітуацыі зносін – адна мова". Стварэнне натуральнай беларускамоўнай атмасферы ва ўстанове дашкольнай адукацыі як умова авалодання дзецьмі дашкольнага ўзросту маўленнем на беларускай мове.

#### Тэма 3. Спецыфіка навучання рускамоўных дашкольнікаў беларускай мове як роднай

Стратэгія навучання дашкольнікаў беларускай мове. Л.С. Выгоцкі аб шляхах авалодання роднай і другой мовамі. Своеасаблівасць “стыхійнай” і арганізаванай формаў авалодання беларускай мовай. Суадносіны паміж рэцэптыўным і прадуктыўным двухмоўем дзяцей. Спантанная, вучэбна-

маўленчая, мастацка-маўленчая і моўна-пазнавальная дзейнасць дашкольнікаў у працэсе авалодання беларускай мовай.

Фарміраванне моўных абагульненняў – асноўны прынцып навучання дашкольнікаў беларускай мове. Узроставыя магчымасці дашкольнікаў у засваенні моўнага матэрыялу. Роля рускай мовы у асваенні беларускай. Маўленчая устаноўка.

Матывацыя маўленчых дзеянняў дашкольнікаў на беларускай мове. Тры класы матываў паводле П.Я. Гальперына. Гульня як крыніца матыву маўленчай дзейнасці у дашкольнікаў. Матывацыя маўленчай, вучэбна-маўленчай, мастацка-маўленчай і моўна-пазнавальнай дзейнасці. Іерархічнасць сістэмы моўных гульняў па навучанні дашкольнікаў беларускай мове.

Сістэматызацыя зместу развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя. Сінхранічная і дыяхранічная пераемнасць моўнага і маўленчага матэрыялу.

**Раздзел II. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту**

**Тэма 4. Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў**

Развіццё ў дзяцей “чуцця” беларускай мовы. Выкарыстанне фальклорных твораў для развіцця рэцэптыўнага і рэпрадуктыўнага двухмоўя, “увядзення” дзяцей у беларускую мову. Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей. “Літаратурны мінімум” дашкольніка. Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дашкольнікаў.

Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дашкольнікаў. Фальклорныя творы як аснова для пазнавальных і асобасных гутарак.

**Тэма 5. Мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту**

Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору. Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі. Методыка работы з беларускай народнай казкай.

Задачы і змест азнаямлення дзяцей з творамі беларускіх пісьменнікаў. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва установе дашкольнай адукацыі

Народныя гульні, рухавыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення.

Методыка правядзення беларускіх народных свят і забаў.

**Тэма 6. Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту**

Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду. Асаблівасці лексікі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Значэнне слоўнікавай работы. Крытэрыі адбору лексікі для заняткаў па развіцці маўлення. Методыка ўвядзення і замацавання слоўніка. Работа над сэнсавым бокам слова.

**Тэма 7. Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту**

Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Крытэрыі адбору граматычнага матэрыялу для развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў. Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення (паводле А.І. Негнявіцкай, А.М.Шахнаровіча). Фарміраванне ў дзяцей навыкаў змянення слоў па формах, утварэння новых слоў, пабудовы сказаў на беларускай мове.

**Тэма 8. Методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту**

Параўнальная характарыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню. Крытэрыі адбору фанемных адзінак і паслядоўнасць іх увядзення. Методыка фарміравання правільнага вымаўлення гукаў і слоў. Знаёмства дзяцей з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускага маўлення.

**Тэма 9. Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту**

Асаблівасці выбару тэм для заняткаў па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага (дыялагічнага і маналагічнага) беларускага маўлення дашкольнікаў. Развіццё выразнасці і вобразнасці маўлення у дашкольнікаў.

Інтэграваны падыход да развіцця рускага і беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

**Тэма 10. Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа**

Методыка правядзення беларускіх народных свят.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ТЭХНАЛОГІЯ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ»

## Дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | | | | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Колькасць гадзін УСР (лекцыі / практычныя заняткі) | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 9 | 10 |
| | Раздзел I. Навуковыя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення | | | | | | | |
| 1. | Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен Сутнасць паняццяў "родная мова", "нацыянальная мова", "другая мова", "замежная мова". | 2 | | | | 2 | [4], [5], [6] | Прэзентацыя, экспрэс-апытанне |
| 2.<br><br><br>2.1 | Станаўленне, сутнасць і асаблівасці двухмоўнага выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі<br>Сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі, яе ўплыў на сферу дашкольнай адукацыі. | 2 | | | | | [4], [5], [6] | Тэсціраванне |
| 2.2 | Асаблівасці руска-беларускага двухмоўя ў дашкольнікаў. Мэта навучання беларускай мове. | | | | | 2 | [4], [5], [6] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.<br>3.1 | Спецыфіка навучання рускамоўных дашкольнікаў беларускай мове як роднай<br>Стратэгія навучання дашкольнікаў беларускай мове. | 2 | 2 | | | | [4], [5], [6] | Праблемныя педагагічныя сітуацыі. |
| 3.2 | Матывацыя маўленчых дзеянняў дашкольнікаў на беларускай мове. | | | | | 2 | [4], [5], [6] | Тэсціраванне |
| | Раздзел II. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. | | | | | | | |
| 4.<br>4.1 | Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў<br>Развіццё ў дзяцей "чуцця" беларускай мовы. | 2 | | | | | [4], [5], [6] | Экспрэс-апытанне |
| 4.2 | Выкарыстанне фальклорных твораў для развіцця рэцэптыўнага і рэпрадуктыўнага двухмоўя, "увядзення" дзяцей у беларускую мову. | | 2 | | | | [4], [5], [6] | Праблемныя педагагічныя сітуацыі*. |
| 4.3 | Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей. | | | | | 2 | [4], [5], [6] | Рэферат* |
| 5.<br>5.1 | Мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту<br>Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору. | 2 | | | | 2 | [1[,[2],[7],[8] | Пісьмовае апытанне |
| 5.2 | Методыка работы з беларускай народнай казкай. | | 2 | | | | [1[,[2],[7],[8] | Пісьмовае апытанне |
| 5.3 | Задачы і змест азнаямлення дзяцей з творамі беларускіх пісьменнікаў. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва установе дашкольнай адукацыі | 2 | | | | 2 | [1[,[2],[7],[8] | Тэсціраванне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5.4 | Народныя гульні, рухавыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення. | | | | | 2 | [1[,[2],[7],[8] | Пісьмовае апытанне* |
| 6. | Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту<br>Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду. | 2 | | | | | [3],[4],[5],[6] | Рэферат |
| 7.<br>7.1 | Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту<br>Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. | <br>2 | 2 | | | | [3],[4],[5],[6] | Праблемныя педагагічныя сітуацыі. |
| 7.2 | Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы. | 2 | | | | 2 | [3],[4],[5],[6] | Абарона праекта |
| 8. | Методыка выхавання гуковай культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту<br>Параўнальная характарыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню. | 2 | | | | | [3],[4],[5],[6] | Экспрэс-апытанне |
| 9. | Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту<br>Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага (дыялагічнага і маналагічнага) беларускага маўлення дашкольнікаў. | 2 | | | | | [3],[4],[5],[6] | Праблемныя педагагічныя сітуацыі. |
| 10.<br>10.1. | Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа<br>Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа. | 2 | 2 | | | | [1],[2],[7],[8] | Гэсціраванне |
| 10.2 | Методыка правядзення беларускіх народных свят і забаў. | 2 | | | | | [1],[2],[7],[8] | Пісьмовае апытанне |
| | **Усяго:** | **26** | **10** | | | **0 / 16** | | |

*мерапрыемствы бягучага кантролю

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ТЭХНАЛОГІЯ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ»

## Завочная форма атрымання вышэйшай адукацыі

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лабараторныя заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 7 | 8 |
| | Раздзел І. Навуковыя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення | | | | | |
| 1. | Білінгвізм як сацыяльна-культурны іпсіхолага-педагагічны феномен | 2 | 2 | | [3], [4], [5], [6] | Тэсціраванне экспрэс-апытанне |
| | Раздзел ІІ. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту | | | | | |
| 2. | Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту | 2 | 2 | | [3], [4], [5], [6] | Тэсціраванне экспрэс-апытанне |
| 3. | Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа | 2 | 2 | | [1], [2], [7], [8] | Тэсціраванне экспрэс-апытанне |
| 4. | Методыка правядзення беларускіх народных свят і забаў. | 2 | 2 | | [3], [4], [5], [6] | Тэсціраванне экспрэс-апытанне |
| | **Усяго:** | 8 | 8 | | | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### ЛІТАРАТУРА

#### АСНОЎНАЯ


1. Старжынская, Н. С. Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту : вучэбны дапаможнік / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : РІВШ. 2022. – 395 с. Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці "Дашкольная адукацыя".
2. Дубініна, Д. М. Родная прырода ў вуснай народнай творчасці / Д. М. Дубініна, А. А. Страха, Д. У. Дубінін. – Мінск, 2012.
3. Дубініна, Д. М. Родныя вобразы ў паэтычным слове : у 2 ч. / Д. М. Дубініна. – Мінск, 2012.
4. Старжынская, Н. С. Вучымся гаварыць на роднай мове : вучэбны наглядны дапаможнік / Н. С. Старжынская. Д. М. Дубініна. – Мінск, 2010.
5. Паліева, Т. У. Развіццё білінгвальнай адукацыі дашкольнікаў у Беларусі (другая палова XX ст. – пачатак XI): манаграфія / Т. У. Паліева. – Мазыр, 2008.
6. Старжынская, Н. С. Маўленчае і лінгвістычнае развіццё дашкольнікаў / Н. С. Старжынская. – Мінск, 2007.


#### ДАДАТКОВАЯ


7. Дубініна, Д. М. Культура Беларусі ў казках і паданнях / Д. М. Дубініна, Д. У. Дубінін. – Мінск, 2008.
8. Старжынская, Н. С. Крылаў не мае, а хутка лятае. Лінгвістычныя гульні для дзяцей 4-7 гадоў / Н. С. Старжынская. – Мінск, 2007.


Гуркова Е. В.

# ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

## Дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі

| Тэма | Заданне па КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|
| Сутнасць паняццяў "родная мова", "нацыянальная мова", "другая мова", "замежная мова" (від заняткаў: практычныя). | Падрыхтоўка прэзентацыі на тэму "Родная мова" | Дэманстрацыя прэзентацыі |
| Асаблівасці руска-беларускага двухмоўя ў дашкольнікаў. Мэта навучання беларускай мове (від заняткаў: практычныя). | Падрыхтоўка канспекта па наступных пытаннях:<br>1. Руска-беларускае двухмоўе дашкольнікаў.<br>2. Навучанне беларускай мове. | Вуснае апытанне на аўдыторных занятках |
| Матывацыя маўленчых дзеянняў дашкольнікаў на беларускай мове (від заняткаў: практычныя). | Прапрацоўка пытанняў:<br>1. Асаблівасці маўлення даўкольнікаў.<br>2. Матывацыя як важны фактар развіцця маўлення дашкольнікаў. | Тэст |
| Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей (від заняткаў: практычныя). | Рэферат па тэме "Віды і прызначэнне лялек пры навучанні маўленню" (тэмы прыкладаюцца). | Абарона рэферата |
| Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору (від заняткаў: практычныя). | Скласці канспект-схему па тэме "Малыя формы беларускага фальклору". | Пісьмовае апытанне на аўдыторных занятках |
| Задачы і змест азнаямлення дзяцей з творамі беларускіх пісьменнікаў. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва установе дашкольнай адукацыі (від заняткаў: практычныя). | Прапрацоўка пытанняў:<br>1. З гісторыі беларускай дзіцячай літаратуры.<br>2. Азнаямленне дзяцей з творамі беларускіх аўтараў.<br>3. Методыка азнаямлення дашкольнікаў з творамі дзіцячай літаратуры. | Тэст |
| Народныя гульні, рухавыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення (від заняткаў: лекцыя). | Скласці канспект-схему па тэме "Віды гульняў пры навучанні беларускаму маўленню дашкольнікаў" | Пісьмовае апытанне на аўдыторных занятках |
| Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы (від заняткаў: практычныя). | Падрыхтоўка пректа па тэме "Выкарыстанне граматычных форм пры арганізацыі беларускаега маўлення дашкольнікаў". | Абарона праекта |

**Праект па тэме “Выкарыстанне граматычных форм пры арганізацыі беларускаега маўлення дашкольнікаў”**

Мэта: вывучэнне граматычных асаблівасцей мовы пры навучанні маўленню дашкольнікаў

Від: інфармацыйны праект

Тэрмін: на працягу семестра

Этапы:

1) падрыхтоўчы этап: вызначэнне граматычных асаблівасцей беларускай мовы

2) інфармацыйны этап: аналіз граматычных асаблівасцей беларускай мовы

3) этап планавання: вывучэнне граматычных асаблівасцей беларускай мовы ў розных узроставых групах дашкольнікаў

4) праца над праектам у групах: аналіз граматычных асаблівасцей пры навучанні ў канкрэтных узроставых групах

5) прадстаўленне вынікаў праекта: прэзентацыя пра асноўныя граматычныя асаблівасці беларускай мовы пры навучанні маўленню дашкольнікаў розных ўзроставых груп

Сфарміраваныя кампетэнцыі:

1. тэндэнцыя да больш яснага разумення каштоўнасцяў і ўстановак у адносінах да канкрэтнай мэты;
2. тэндэнцыя кантраляваць сваю дзейнасць;
3. уцягванне эмоцый у працэс дзейнасці;
4. гатоўнасць і здольнасць навучацца самастойна;
5. пошук і выкарыстанне зваротнай сувязі;
6. упэўненасць у сабе;
7. самакантроль;
8. адаптыўнасць;
9. самастойнасць мыслення, арыгінальнасць;
10. крытычнае мысленне;
11. гатоўнасць вырашаць складаныя пытанні.

# ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ЭКЗАМЕНА

1. Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен
2. Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму.
3. Праблемы ранняга двухмоўя.
4. Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту.
5. Станаўленне, сутнасць і асаблівасці двухмоўнага выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі
6. Сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі, яе ўплыў на сферу дашкольнай адукацыі. Закон аб мовах Беларускай ССР.
7. Пытанні маўленчага развіцця дашкольнікаў у Канцэпцыі развіцця дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (2000 г.).
8. Асаблівасці руска-беларускага двухмоўя ў дашкольнікаў.
9. Мэта навучання беларускай мове. Дыдактычныя, выхаваўчыя, развіццёвыя і сацыялізуючая мэтавыя арыентацыі навучання.
10. Задачы і змест работы па развіцці маўлення ў вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі.
11. Лінгвакультаралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове.
12. Спецыфіка навучання рускамоўных дашкольнікаў беларускай мове як роднай.
13. Стратэгія навучання дашкольнікаў беларускай мове. Л.С. Выгоцкі аб шляхах авалодання роднай і другой мовамі.
14. Фарміраванне моўных абагульненняў – асноўны прынцып навучання дашкольнікаў беларускай мове.
15. Гульня як крыніца матыву маўленчай дзейнасці у дашкольнікаў.
16. Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
17. Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей.
18. Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дашкольнікаў.
19. Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дашкольнікаў.
20. Мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту
21. Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору.
22. Методыка работы з беларускай народнай казкай.
23. Задачы і змест азнаямлення дзяцей з творамі беларускіх пісьменнікаў.
24. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі
25. Народныя гульні, рухавыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення.

26. Методыка правядзення беларускіх народных свят і забаў.

27. Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту.

28. Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту.

29. Методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

30. Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

31. Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа.

32. Методыка правядзення беларускіх народных свят.

# ПЕРАЛІК ТЭМ РЭФЕРАТАЎ

1. Родная мова – душа народа.
2. Мова і гістарычная памяць.
3. Рупліўцы на ніве роднай мовы.
4. Беларусы ў свеце.
5. Паходжанне назвы Белая Русь.
6. Нашы славутыя землякі.
7. Вядомыя беларускія лінгвісты.
8. Выдатныя дзеячы беларускай культуры.
9. Мой любімы пісьменнік.
10. Мой любімы твор.
11. Народнае дойлідства Беларусі.
12. Сімволіка беларускіх народных песень.
13. Традыцыйныя народныя святы.
14. Старонкі беларускага народнага календара.
15. «Фізікі» і «лірыкі».
16. Псіхалогія публічнага выступлення.
17. Віды і прызначэнне лялек пры навучанні маўленню.
18. Увядзенне слоўніка беларускай мовы пры навучанні беларускаму маўленню.

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Пры вывучэнні дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя формы самастойнай працы: складанне эсэ, прэзентацый, сітуацый зносін, канспекта заняткаў, падбор мастацкіх твораў.

**Змест самастойнай работы студэнтаў**
**(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)**

| Від самастойнай работы | Тэматычны змест і выкарыстаныя крыніцы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| Паглыбленае вывучэнне тэм вучэбнай дысцыпліны | Тэма 1.<br>Скласці эссе (прэзентацыю)"Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен"<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 2 |
| | Тэма 2.<br>Скласці прэзентацыю"Станаўленне, сутнасць і асаблівасці двухмоўнага выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі"<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 2 |
| | Тэма 3.<br>Скласці прэзентацыю"Спецыфіка навучання рускамоўных дашкольнікаў беларускай мове як роднай "<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 2 |
| | Тэма 4<br>Падабраць гульні і скласці сітуацыі зносін па фарміраванні камунікатыўных уменняў у дзяцей дашкольнага ўзросту.<br>Літаратура: [9],[4], [5], [6]. | 2 |
| | Тэма 5.<br>Падабраць мастацкія творы для арганізацыі гульняў драматызацый з дзецьмі дашкольнага ўзросту. Скласці прэзентацыю "Тэатралізаваныя гульні як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту"<br>Літаратура: [1],[2], [7], [8]. | 2 |
| | Тэма 6.<br>Скласці канспекты заняткаў па развіцці беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту для ўсіх узроставых груп.<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 2 |
| | Тэма 7.<br>Скласці прэзентацыю "Метады і прыёмы фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту"<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| | Тэма 8.<br>Скласці канспекты заняткаў па развіцці<br>беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту для ўсіх узроставых груп.<br>Падрыхтаваць відэязапіс заняткаў па развіцці беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту. ( узроставая група па выбары студэнта) Скласці прэзентацыю "Метады і прыёмы развіццябеларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 2 |
| | Тэма 9<br>Скласці канспекты заняткаў па развіцці беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту для ўсіх узроставых груп.<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 2 |
| | Тэма 10.<br>Скласці прэзентацыю "Методыка правядзення беларускіх свят»<br>Літаратура: [1],[2], [7], [8]. | 2 |
| Падрыхтоўка да экзамена | | 36 |
| **Усяго** | | **56** |

## Змест самастойнай работы студэнтаў (завочная форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| Від самастойнай работы | Тэматычны змест і выкарыстаныя крыніцы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| | Тэма 1.<br>Скласці эссе (прэзентацыю)"Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен"<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 6 |
| | Тэма 2.<br>Скласці прэзентацыю"Станаўленне, сутнасць і асаблівасці двухмоўнага выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 6 |
| | Тэма 3.<br>Скласці прэзентацыю"Спецыфіка навучання рускамоўных дашкольнікаў беларускай мове як роднай "<br>Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 6 |
| | Тэма 4 | 6 |

| | | |
|---|---|---|
| Паглыбленае вывучэнне тэм вучэбнай дысцыпліны | Падабраць гульні і скласці сітуацыі зносін па фарміраванні камунікатыўных уменняў у дзяцей дашкольнага ўзросту. Літаратура: [9],[4], [5], [6]. | |
| | Тэма 5. Падабраць мастацкія творы для арганізацыі гульняў драматызацый з дзецьмі дашкольнага ўзросту. Скласці прэзентацыю "Тэатралізаваныя гульні як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту" Літаратура: [1],[2], [7], [8]. | 6 |
| | Тэма 6. Скласці канспекты заняткаў па развіцці беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту для ўсіх узроставых груп. Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 6 |
| | Тэма 7. Скласці прэзентацыю "Метады і прыёмы фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту" Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 6 |
| | Тэма 8. Скласці канспекты заняткаў па развіцці беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту для ўсіх узроставых груп. Падрыхтаваць відэазапіс заняткаў па развіцці беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту. ( узроставая група па выбары студэнта) Скласці прэзентацыю "Метады і прыёмы развіцця беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 4 |
| | Тэма 9 Скласці канспекты заняткаў па развіцці беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту для ўсіх узроставых груп. Літаратура: [3],[4], [5], [6]. | 4 |
| | Тэма 10. Скласці прэзентацыю "Методыка правядзення беларускіх свят» Літаратура: [1],[2], [7], [8]. | 6 |
| Падрыхтоўка да экзамена | | 36 |
| **Усяго** | | **92** |

# КАНТРОЛЬ ЯКАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ

Дыягностыка якасці засваення ведаў праводзіцца ў форме бягучага кантолю і прамежкавай атэстацыі.

Дыягностыка якасці засваення ведаў студэнтаў ажыццяўляецца падчас выступу студэнтаў на практычных занятках, правядзення тэстаў па асобных раздзелах дысцыпліны, вуснага апытання падчас практычных заняткаў, абароны рэфератаў.

У рамках рэйтынгавай сістэмы паспяховасць студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне ацэньваецца з дапамогай мерапрыемстваў бягучага кантролю, якія праводзяцца на працягу семестра і ўключае ў сябе наступныя формы кантролю: рэферат, праблемныя педагагічныя сітуацыі, пісьмовае апытанне.

Вынік бягучага кантролю за семестр ацэньваецца адзнакай у балах па дзесяцібальнай шкале і выводзіцца зыходзячы з адзнак, выстаўленых выкладчыкам (выкладчыкамі) падчас правядзення мерапрыемстваў бягучага кантролю на працягу семестра, па наступнай формуле:

БК = Б1+Б2+Б3........+ Бn / n,

дзе Б1,2…n – адзнака за мерапрыемства бягучага кантролю,

n – колькасць мерапрыемстваў бягучага контролю.

Для студэнта, які прапусціў мерапрыемства бягучага кантролю па ўважлівай прычыне, кафедрай устанаўліваюцца дадатковыя тэрміны. Студэнтам, якія прапусцілі мерапрыемства бягучага кантролю без уважлівай прычыны, выстаўляецца 1 (адзін) бал за гэтае мерапрыемства.

Дадзеная адзнака таксама ўлічвае вынікі ўдзелу студэнта ў навукова-практычных мерапрыемствах, вучэбна-даследчай, навукова-даследчай працы студэнтаў (канферэнцыях, семінарах, алімпіядах, конкурсах, навуковых гуртках і г.д.) па профілю дысцыпліны і можа быць павышана да 10 балаў пры дасягненні значных вынікаў у гэтай працы.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў форме экзамена. Выніковая адзнака па вучэбнай дысцыпліне разлічваецца на аснове выніку бягучага кантролю за сяместр і адзнакі, атрыманай за адказ па білеце, па формуле:

$$B = k \cdot БК + (1 - k) A$$

дзе *B* – выніковая адзнака па вучэбнай дысцыпліне (модулю); *k* – вагавы каэфіцыент бягучага кантролю, роўны 0,5; БК – вынік бягучага кантролю за сяместр; А – адзнака па дзесяцібальнай шкале, атрыманая за адказ па білеце.

Для навучэнцаў завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі выніковай з'яўляецца адзнака, атрыманая за адказ па білеце на экзамене. Станоўчай з'яўляецца адзнака не ніжэй за 4 (чатыры) балы.

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ**
**З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Этнапедагогіка | Кафедра ТіМВ | няма | |

Загадчык кафедры ТіМВ
канд. гіст. навук, дацэнт Н.В. Даўгяла